# Выкладчыцу канчаткова звольнілі...

## На яе месца ўжо ўзялі іншую



**У нумары ад 23 сакавіка \ мы распавялі гісторыю выкладныцы харэаграфіі Універсітэта культуры Надзеі Лаўрухінай. Яе як пенсіянерку звальняюць у сувязі са сканчэннем кантракта. Аднак, нягледзячы на свае 63 гады, Надзея Міхайлаўна бліскуча выкладае свой прадмет (у харэографаў фізічнае старэнне адбываецца зусім інакш). За яе ўступіліся студэнты — «Звязда» атрымала ліст з 49 подпісамі. Уступіліся таксама некаторыя выкладчыкі, шмат былых выпускнікоў...**

**У тым артыкуле мы звярнуліся па каментар да трох афіцыйных асобаў універсітэта — прарэктара, дэкана і загадчыцы кафедры. Сэнс іх каментароў быў такі: мы прапануоўваем ёй працаваць і далей на ўмовах пагадзіннай аплаты, а яна адмаўляецца.**

— Мой кантракт скончаўся 29 сакавіка, — кажа Надзея ЛАЎРУХІНА. — За колькі дзён да гэтага, 25 сакавіка, я вырашыла зрабіць так, як яны мне самі прапанавалі — працягнуць кантракт да канца навучальнага года. А там было б відаць. Аднак калі я прынесла заяву да дэкана, тая сказала: «Ужо позна». Я не зразумела, чаму позна, бо паводле закона магу падаваць заяву да 29 числа ўключна. Пайшла ў аддзел кадраў, а кіраўнік кажа мне: «На вашае месца ўжо ўзялі іншага чалавека. Прыходзьце заўтра, забірайце працоўную кніжку і разлік. Мы вас больш не затрымліваем»...

Вось так развіталіся з чалавекам, які адпрацаваў ва універсітэце 32 гады, трацiну стагоддзя! Зноў жа, як і ў мінулай публікацыі, паўторым — юрыдычна ўніверсітэт мае права не працягнуць кантракт выкладчыку, узяць на яго месца іншага. Для газеты супрацоўнікі ўніверсітэта кажуць, што «яшчэ раз паразмаўляюць з выкладчыцай, студэнтамі», а самі ўжо ведаюць, што знойдзены новы чалавек?

— Афіцыйна мне нічога не гавораць пра асобу новага выкладчыка, — кажа Надзея Міхайлаўна. — Аднак я даведалася, што гэта мая выпускніца-завочніца, якая працавала ў дзяржансамблі танцоўшчыцай. Я шчыра зычу ёй усялякіх поспехаў!

Пазіцыя ўніверсітэта была поўна выказаная ў мінулай публікацыі. Выглядае, што яна не змянілася: «Паводле закона мы ўсё робім правільна».

Аднак гэтая публікацыя выклікала велізарную рэакцыю ў інтэрнэце. Прыводзім некаторыя каментары з сайта «Звязды» (zviazda.by), усяго іх — **47.**

**Г. Л.**

**Валерыя Корань.** Надзея Міхайлаўна Лаўрухіна ніколі не дазволіць сабе пакрыўдзіць чалавека (студэнта), тым больш абляаць матам, яна эмацыйная і адкрытая, вельмі перажывае за сваю справу і сваіх выхаванцаў і кантралюе сябе, якім моцным слоўцам (але заўважу, не мацюкамі), ды яшчэ і з выкарыстаннем вобразнасці данесці пэўную думку да канкрэтнага чалавека. Я адвучылася 5 гадоў на курсе, дзе Надзея Міхайлаўна была куратарам акадэмічнай групы, і проста не магу заставацца ўбаку. Лепшага выкладчыка па народна-сцэнічных танцах няма ў рэспубліцы.

@ @ @

**Банцэвіч.** Безумоўна, для спецыяліста ўзроўню Лаўрухінай прапанова пра сумяшчальніцтва — знявага, недарэчнасць...

@ @ @

**Ганна Куко (выпускніца).** Сорамна за родны ўніверсітэт, бо ТАКІ педагог годны сысці на заслужаны адпачынак з усімі шанаваннямі — творчы вечар у яе гонар, як мінімум. Навошта недагаворкі? Я скажу, чаму я ў яе навучылася: любіць народны танец, адчуваць сваё дачыненне да культуры іншых народаў. Надзея Міхайлаўна не проста выдавала традыцыйныя па, яна вучыла мяне разумець сэнс і ідэю руху танцаў, якія танчаць рускія, італьянцы, грузіны, палякі, каб, зразумеўшы сутнасць, я змагла якасна скласці свой аўтарскі нумар. І таму яна на занятках то руская пані, то гарачая цыганка, то сціплая ўкраінская дзяўчына, а бывала, і хвацкі мужык у ліхой прысядцы Калі хтосьці вырашыў, што на ўроках Надзея Міхайлаўна лаецца, то ён проста не знаёмы з фальклорам, які яна выкарыстоўвае ў патрэбны час у патрэбным месцы! Яшчэ раз вялікі дзякуй, Надзея Міхайлаўна, за вашу нялёгкую, але вельмі патрэбную працу.

@ @ @

**Перапечка Саша.** Нібыта дарослыя людзі працуюць на кафедры, а ўсё, як звычайна! Легенду немагчыма звольніць, яна ў вечнасці — Avisus avisus impasus!

@ @ @

**Мя.** Ды што тут! Дзве ба... прашу прабачэння, дамы пасварыліся, а студэнты толькі ў ролі гарматнага мяса выступаюць. Недагаворваюць і тая, і другая. Напрыклад, фраза загадчыцы кафедры аб ценявым лідары, хм... занадта наіўна з яе боку было б так сказаць проста ў твар! Хутчэй, гэта прыгожая легенда пакрыўджанага боку. Урэгуляваць сітуацыю можа толькі пасярэднік. Інакш ваенныя дзеянні могуць нанесці сур'ёзны ўрон студэнтам, а гэтага вельмі не хацелася б. Бо яны даверліва, адкрыта і крыху наіўна ахвяруюць далейшым лёсам ва ўніверы.

@ @ @

**Апена Кірпічэнка, Алеся** Шубіна, **Лера Баландзіна і мноства, мноства...** Мы кажам ад свайго імя і ад імя камісіі харэаграфіі Віцебскага дзяржаўнага каледжа культуры і мастацтваў. Палова педагогаў харэаграфіі каледжа — выпускнікі курса або навучэнцы Надзеі Міхайлаўны Лаўрухінай. Астатнія — людзі, якія ведаюць пра Надзею Міхайлаўну толькі лепшае, гэта датычыцца ў першую чаргу прафесіяналізму гэтага чалавека. Атрымліваецца, што выбітнага чалавека, які працуе, перажывае за справу, а не за ўшанаванні, заслужыў павагі і падзякі, выкідваюць за борт, праследуючы свае асабістыя інтарэсы. Усё па законе. Брава. Шкада, што барацьба за справядлівасць — справа няўдзячная. Надзея Міхайлаўна, Вам ад нас і многіх Вашых выпускнікоў — ДЗЯКУЙ.

@ @ @

**Я.** Божа мой! Што адбываецца са студэнтамі кулька? Я шмат гісторый чула, але не ўяўляла, што ўсё так страшна. Ды вы быццам пад гіпнозам Лаўрухінай! Яна вас як гарматнае мяса выкарыстоўвае, а вы радуецеся. Апамятайцеся, людзі! Не самы лепшы момант праяўляць свой максімалізм.

@ @ @

**Георгій Чорны, заслужаны работнік культуры РБ.** З вялікім жалем даведаўся аб гэтым выпадку. Вельмі шкада, што так адбылося з маім педагогам, якая выхавала не адну сотню харэографаў. Надзея Міхайлаўна — чалавек-легенда ў харэаграфічным свеце і не толькі ў Беларусі. Сустракаў яе выхаванцаў за мяжой (да прыезду ў Беларусь яна выкладала народна-сцэнічны танец у Кемераве). Няма сэнсу гаварыць яшчэ раз пра яе прафесіяналізм. Пра гэта ўжо сказалі студэнты.

Які яна чалавек? Можа быць розна, у залежнасці ад абставін ці настрою. Праца харэографа — гэта не толькі трэнаж, але і даволі складаная псіхалагічная нагрузка. Выдатны педагог танца, як правіла, эмацыйная асоба, інакш не можа быць. Аднак мне не хочацца думаць, што Надзея Міхайлаўна пераступіла нейкую рысу. Яна чалавек даволі прамы. Але студэнтам ад гэтага толькі лепш. Я, як і іншыя, не можам каментаваць сітуацыю, якая адбылася ва Універсітэце культуры, аднак хочацца спадзявацца, што яна вырашыцца так, каб прафесійны і чалавечы гонар Надзеі Міхайлаўны не быў закрануты.

Вялікі дзякуй Вам, Надзея Міхайлаўна!

@ @ @

**0. К. Мацкевіч, выкладчык харэаграфічнага каледжа.** Калі я даведалася пра тое, што адбылося, — у мяне быў проста шок. Мне 66 гадоў. Скончыўшы 9-гадовае навучанне ў харэаграфічнай вучэльні і маючы педагагічны стаж у ёй жа, я пастуліла (толькі ўтварыўся курс) у Мінскі інстытут культуры. Гэта быў 1977 год, і мне было 32 гады. А маім педагогам па народным танцы стала Надзея Міхайлаўна Лаўрухіна, якая была маладзейшая за мяне на 2 гады.

Гэта — Педагог ад Бога. Я шчаслівая, што з'яўляюся яе вучаніцай.

@ @ @

Рыгор Васільеў. Калі ласка, пачытайце ўважліва. Усе водгукі (большасць), якія тут напісаны, — ад асобаў студэнтаў. І толькі гэтую мову яны разумеюць — прама і цвёрда, за што і ўдзячныя — «мала вы нас білі» (маё выказванне).

Чаму маўчаць тыя, хто ведае Надзею Міхайлаўну не па класе, а па працы на кафедры, па манеры стасункаў з калегамі? Не ў гасцях, у абласцях і г.д., а ў БДУКМ? Гэта значыць, як педагог яна супер, гэта я чую, а які яна супрацоўнік?

Далей — «ценявы лідар» кіруе людзьмі, арганізуе іх. І ценявыя лідары вельмі ў цане ў начальства! І ў арміі, і ў турме, і ўсюды, дзе начальства не хоча займацца кіраўніцтвам, але Гуткоўскую відаць і на міжнародных фестывалях, і на дзяржаўных мерапрыемствах — відаць з яе выхаванцамі, ды і навуковы свет яе ведае, і не толькі беларускі. Каго і куды вывезла Н.М.? Ці ёй зноў нехта перашкодзіў?

@ @ @

Госць. Сітуацыя цікавая тым, што студэнты і выпускнікі ўсталі ЗА выкладчыка. Такое сапраўды, як і піша журналіст, бывае рэдка. Не мне судзіць, хто з іх: начальніца або падпарадкаваная маюць рацыю, АЛЕ!!! «ЗА» падначаленую каментароў вельмі шмат, а «ЗА» начальніцу ніхто са студэнтаў або выпускнікоў «не заступіўся». Спачатку мне здалося, што начальніца толькі адміністрацыйнай працай займаецца, але з паведамлення Рыгора Васільева апынулася, што ў яе таксама ёсць выхаванцы. Чаму ж ЯНЫ не выказваюцца? Гэта ж інтэрнэт — тут любы мінак можа сказаць тое, што думае. Дзіўна.

@ @ @

Кот. А я думаю, што абедзве добрыя! Адна перагнула палку, а ў другой скончылася цярпенне... Усе ведаюць, што Лаўрухіна за чалавек )) Але я і не адмаўляю, што яны абедзве адмыслоўцы ў сваёй справе! І абедзве зрабілі вялікі ўнёсак!

@ @ @

Госць. Прычым тут — які Лаўрухіна чалавек? Хто гэтыя «ўсе», хто ведаюць? Тут пішуць пакуль у асноўным добрае.

@ @ @

Сяргей М. Як вы думаеце, ці можна з электрыка за 5 гадоў зрабіць прафесійнага харэографа? Так, можна, калі за справу возьмецца Надзея Міхайлаўна. Гэта не проста абстрактныя словы, гэта мая гісторыя. Толькі дзякуючы Надзеі Міхайлаўне з мяне атрымаўся «чалавек» (у харэаграфічным сэнсе слова). Доўга расхвальваць Надзею Міхайлаўну не буду, усё ўжо напісана ў папярэдніх каментарах. Проста хочацца сказаць вялікі ДЗЯКУЙ за маленькі цуд.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ